


***31 студзеня ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася фотавыстава «Чырванаборскі край». Гэта вынік работы Чырванаборскай школы фатаграфіі ў турыстычным комплексе «Чырвоны Бор» з 21 па 30 жніўня 2022 г.***

У экспазіцыі прадстаўлены здымкі вядомых беларускіх фатографаў: аўтара ідэі і куратара праекта Сяргея Плыткевіча, педагогаў Валерыя Вядрэнкі, Ірэны Гудзіеўскай, Віктара Малышчыца, Сяргея Мілюхіна і Наталлі Лакотка, студэнтаў-пераможцаў Рэспубліканскага фотаконкурсу «Маладзёжны погляд» Ганны Беражковай, Івана Веразуба, Ганны Дамінікі Грыб, Марыі Зіганоравай, Міхаіла Лук'янчыка, Валеры Пратасевіч.

У экспазіцыі – прыродныя ландшафты, лясныя экасістэмы, рэдкія расліны і жывёлы, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Фатаграфіі кранаюць чароўнымі відамі ледавіковых азёр, рэк і ручаёў, балот, пагоркаў, лясоў і чорнаальшанікаў, адчуваннем вольнай прасторы і захапляльнай натуральнасці Чырванаборскага краю. Зорнае неба і возера Ізубрыца, туман над возерам Белае, рака Свольна здзіўляюць веліччу з вышыні птушынага палёту. Заварожваюць партрэты зуброў, зязюлі, зімародка, даўгахвостай кугакаўкі, дынамічныя і характарныя фота ласей, аленей, ланей і іншых жыхароў пушчы.

Выстава знаёміць гледачоў не толькі з буйнейшым у Беларусі Рэспубліканскім ландшафтным заказнікам «Чырвоны Бор», але і з архітэктурнай спадчынай, што захавалася на поўначы Верхнядзвінскага раёна. Здымкі Успенскай царквы ў вёсцы Сар'я, руіны палаца Гільзенаў і Шадурскіх у Асвеі, рэшткі званіцы царквы Ефрасінні Полацкай у Росіцы не пакінуць гледачоў абыякавымі. Фотаработы прадстаўлены ўвазе гледачоў упершыню.

Выстава будзе працаваць да 9 красавіка.